# Выступленне К. В. Кісялёва на прэс-канферэнцыі ў Сан-Францыска

САН-ФРАНЦЫСКА, 23 мая. (Спец. кар. ТАСС). Старшыня Беларускай дэлегацыі на канферэнцыі Аб'еднаных нацый тав. К. В. Кісялёў выступіў 23 мая на прэс-канферэнцыі ў Сан-Францыска з заявай аб Беларускай ССР, пасля чаго адказаў на пытанні карэспандэнтаў. У заяве тав. Кісялёва гаворыцца:

«Нашу першую прэс-канферэнцыю я намеціў прысвяціць азнаямленню прадстаўнікоў друку з рэспублікай, якую прадстаўляе наша дэлегацыя на канферэнцыю ў Сан-Францыска.

Беларусь—краіна з 10-мільённым насельніцтвам, знаходзіцца на вярхоўях рэк Дняпра, Заходняй Дзвіны, Нёмана і іх прытоках. Яна займае 225 тысяч квадратных кіламетраў і па тэрыторыі значна больш такіх еўрапейскіх дзяржаў, як Бельгія, Швейцарыя і Галандыя. Сталіцай Беларусі з'яўляецца горад Мінск.

Тэрмін «Беларусь» упершыню сустракаецца ў XIV веку і з XIV века атрымлівае шырокае распаўсюджанне сярод суседніх народаў. Паходжанне самой назвы «Беларусь» трактуецца розна. Абумоўлена яно, як відаць, геаграфічнымі і этнаграфічнымі фактарамі. У якасці прыкладу можна ўказаць, што ў мінулым нацыянальная вопратка амаль усіх беларусаў была белага колеру.

У многіх афіцыяльных дакументах і газетах слова «Беларусь» перакладаецца як «Уайт Раша». Гэта няправільна. Неабходна пісаць так: «Беларашэн Совьет Сошыяліст Рыпаблік».

Продкі беларускага народа — славянскія плямёны, дрыгавічы, радзімічы і крывічы.

К XV і XVI вякам беларускі народ дасягнуў параўнаўча высокага ўзроўню свайго сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця і стаў адным з перадавых народаў Усходняй Еўропы. У беларусаў параўнаўча рана развілося кнігадрукаванне. Першая кніга надрукавана буйнейшым асветнікам беларускага народа, яго першадрукаром Георгіем Скарынай у 1517 годзе, на 56 год раней пабачення ў свет першай рускай друкаванай кнігі. Беларуская мова з'яўлялася агульнапрынятай дыпламатычнай мовай ва Усходняй Еўропе і дзяржаўнай мовай у Літоўска-Беларускім княжастве.

З XVI века Беларусь знаходзілася пад уладай Польшчы, з канца XVIII века яна ўваходзіла ў састаў рускай дзяржавы.

Перыяд сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання, які прыш-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ